ДЗВІНСКІ ЎЗГОРАК


*Кроч на свой родны,
дзвінскі ўзгорак,
каб глядзець
у будучую сінь*

ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА ВІЦЕБСКАГА РАЁНА, №1 (161)
СТУДЗЕНЬ 2023 ГОДА

КРАЯЗНАЎСТВА

ЦІКАВАЯ КНІГА ПРА ВОРШУ

Краязнаўца Віктар Сцяпанаў выдаў кнігу “Рьша, Орша, Ворша: гісторыя горада ад старажытнасці да сярэдзіны XIX стагоддзя”. Аўтар распавядае пра гісторыю гэтага славутага горада ад старажытнасці на XIX стагоддзя на падставе малавядомых фактаў.



Аўтар прапануе сваю кнігу ўсім, каго цікавіць гісторыя Беларусі, а ў прыватнасці — Оршы. Спадар Сцяпанаў адзначае, што ў кнізе маецца не толькі пералік больш альбо менш вядомых фактаў, але і апісанне працэсу паступовага нараджэння і ўсталявання гарадской грамады як асновы, з якой пазней вырасла і на падставе якой сфарміравалася сучаснае еўрапейскае грамадства.

— Я паспрабаваў больш падрабязна паказаць працэс пераўтварэння памежнага ўмацавання ў складанае і шматаблічнае сацыяльнае ўтварэнне, развіццё якога на пэўным этапе пачало падпарадкоўвацца сваім унутраным эканамічным і сацыяльным законам, а з другога боку, стала асновай развіцця ў глыбіні традыцыйнага феадальнага грамадства пачаткаў новай буржуазнай цывілізацыі, у тым ліку сучаснай дэмакратыі і рэспубліканскай формы кіравання, — кажа ён.

Таксама аўтар спрабуе асобна адзначыць значэнне ў развіцці горада агульнаеўрапейскіх працэсаў, у прыватнасці, Рэфармацыі і Контррэфармацыі, а таксама спецыфічны беларускі характар міжканфесійнай палемікі, які дазваляў абысціся без звычайных для той эпохі праяў масавага гвалту, але спрыяў развіццю кнігадрукавання і мастацтва. Кніга ўтрымлівае мае спробы паразважаць над лёсам роднага горада, і ацаніць тыя выпрабаванні, якія давялося яму перажыць, і згадаць тых людзей, чые ўчынкі адбіліся на ягонай гісторыі.

Кошт кнігі **“Рьша, Орша, Ворша: гісторыя горада ад старажытнасці да сярэдзіны XIX стагоддзя”** 20 рублёў. Гэтыя грошы трэба будзе заплаціць ў якасці накладных выдаткаў, разам з коштам перасылкі, падчас атрымання дасланай накладзеным плацяжом кнігі на пошце.

Заяўку на набыццё кнігі трэба дасылаць аўтару па электроннай пошце на адрас ***stsiapanausmail@gmail.com.*** У гэтым лісце неабходна пазначыць паштовы адрас, па якімбудзе адпраўленая бандэроль з кнігай.

А.Адамаў

Чытайце сайт Віцебскага раёна:
http://vicebskreg.by

АНЛАЙН-АПЫТАННЕ

В НОВЫЙ ГОД С НАДЕЖДОЙ

Новогодняя пора это период не только праздничного настроения и приятных хлопот, но и время подведения итогов, построения планов на будущий год. Текущий год был непростым, неоднозначным. Как изменилась жизнь горожан, и каких перемен они ожидают? На каких ценностях строят свою жизнь? На эти вопросы помогут ответить результаты социологического онлайн-опроса жителей города Витебска*, проведенного отделением по Витебской области Белорусского института стратегических исследований (БИСИ) в третьей декаде ноября. Для «Витьбичей» итоги расшифровал аналитик БИСИ Андрей Мишин.

Не в деньгах счастье?

Большинство респондентов (51,4%) оценивают свой уровень дохода как средний и лишь 3% как высокий. Высокий доход отмечен только среди респондентов в возрасте 18–30 лет, независимо от пола. Оценивает свой доход как низкий каждый второй мужчина, а в возрасте 18–30 лет – 72,2 % респондентов. Данные оценки никак не формализованы и нацелены на личностное восприятие своего дохода и требований к нему и качеству своей жизни в целом.

Преобладающая часть респондентов (56,2%) считает, что уровень их доходов в текущем году не изменился. О снижении доходов сказали 27,6% причем такой был наиболее популярен среди мужчин в возрасте 46–58 лет и женщин старше 59. Об увеличении доходов говорит каждый шестой респондент, а среди мужчин – каждый пятый, и, в частности, каждый четвертый горожанин в возрасте 18–30 лет независимо от пола.

Результаты опроса позволяют отметить, что в настоящий момент респонденты в целом довольны своей жизнью: утвердительно ответили 72,4%. Наиболее удовлетворены текущей жизнью женщины (78,2%). Абсолютно недовольны жизнью 9,5% участников, а среди мужчин таких почти 14%.

Позитивно оценивает свою текущую жизнь большинство (свыше 70%) респондентов в возрасте 18–58, а вот среди горожан старше 59 лет таких половина.

Витебчанки-оптимистки или с надеждой в новый год

Если говорить об оценках предстоящего года, то практически половина участников опроса рассчитывает на позитивные изменения. Наиболее позитивны, ненамного, но... – женщины. При этом каждая третья представительница прекрасной половины человечества затруднилась в оценках будущего года своей жизни. Среди мужчин не определился каждый пятый. Ухудшения ситуации через год ожидает каждый шестой мужчина и лишь 3% женщин. Причем, что удивительно, пессимистичны мужчины в возрастных группах 18–30 и 46–58 лет, а женщины – 31–45.

Преимущественно оптимистичные настроения жителей областного центра подтверждаются и теми планами, которые определили для себя респонденты на ближайший год: свыше 38 % участников опроса планируют повышать уровень своей квалификации или учиться, около 21% собираются сменить место работы. Присутствуют намерения, связанные со сменой места жительства: 10,5%

(працяг на стар. 2)

ЭКАЛОГІЯ

ВОДА СТАНЕТ ЧИЩЕ

Станции обезжелезивания воды построят в этом году в четырех населенных пунктах Витебского района.

Итоги и перспективы сферы ЖКХ обсудили на сессии Витебского райсовета.

Станции обезжелезивания воды построят в этом году в деревнях Присушино и Сущево, агрогородках Вымно и Шапечино. А в четырех населенных пунктах, где они уже есть, подключат резервную скважину.

Итоги и перспективы сферы ЖКХ обсудили на сессии райсовета. По информации финансового отдела Витебского райисполкома финансирование жилищно-коммунального хозяйства на 2023 год запланировано в размере 7,2 миллиона рублей — 11,5 процента всех расходов бюджета района. Для сравнения, в 2022-м — 10,6 процента.

На текущий и капитальный ремонты жилфонда выделено более 1,6 миллиона рублей (соответственно 140 тысяч и 1,5 миллиона рублей). На уличное освещение будет израсходовано 600 тысяч рублей, замену осветительных приборов на энергоэффективные — 68,2 тысячи рублей, уборку придомовых территорий — 251,5 тысячи рублей, содержание и ремонт объектов благоустройства (дворы, газоны) и содержание улично-дорожной сети населенных пунктов — 634,8 тысячи рублей.

На ремонт и асфальтирование дорог из районного и областного бюджетов выделено на год более 320 тысяч рублей.

Также предусмотрены субвенции из республиканского бюджета на финансирование расходов по текущему ремонту улично-дорожной сети населенных пунктов — 200 тысяч рублей. Предусмотрено субсидирование жилищно-коммунальных услуг, предоставляемых населению, в размере 3,8 миллиона рублей.

«Прямые линии» для граждан позволят руководству района оперативно реагировать на возникающие проблемы ЖКХ, принимать управленческие решения, способствующие эффективной деятельности в сфере, касающейся всех жителей Придвинья.

«Витьбичи»
Александр ПУКШАНСКИЙ

АНЛАЙН-АПЫТАННЕ

(пачатак на стар. 1) респондентов планируют переехать в другой регион. Не настроены на какие-либо перемены в жизни 23,8% участников опроса. Каждый пятый затруднился с ответом по планам на ближайший год и среди них преобладают мужчины.

Главные ценности

А были и те, кто уже точно определился со своими планами на ближайший год и готовится к появлению новых витебчан. В этой связи важно подчеркнуть какими ценностями руководствуются жители нашего города.

Основополагающей жизненной ценностью 79% участников опроса считают семью (более 60% среди всех возрастных групп, а наименьшее значение получено среди женщин в возрасте 18–30 лет). Второе-третье место среди главных ценностей и приоритетов занимают здоровье (47,6%) и самореализацию и духовный рост (всего 40%, но для женщин это четвертый по значимости приоритет, а для мужчин второй). Это свидетельствует о преобладании морально-нравственных приоритетов в жизни витебчан.

Порядка 38%, а среди женщин - 42%, считают значимой финансовую стабильность. Каждый третий респондент отмечает приоритетность успешной карьеры, каждый пятый - личной свободы, каждый шестой – отдых, развлечения, путешествия и общение, дружбу.

Стоит отметить, что о приоритете общения и дружбы высказался каждый второй респондент старше 59 лет. Помните об этом и не забудьте поздравить своих родных и знакомых с наступающими праздниками.

Онлайн-опрос проводился среди совершеннолетних жителей города. Среди участников анкетирования преобладали лица в возрасте 18–30 лет (порядка половины респондентов), а также категория 31–45 лет (каждый третий). Наименее представлена была категория горожан старше 59 лет (менее 6%). Социальный статус большинства участников - «студент» (44,8%) и «наемный работник» (43,8%). Были среди респондентов предприниматели, самозанятые лица, пенсионеры. В гендерном разрезе преобладали женщины (65,7%), мужчины составили 34,3% участников.

«Витьбичи»

ЗДАРЭННІ

В НОВЫЙ ГОД С ДТП

56 ДТП произошло за новогодние выходные в Витебской области.

В ГАИ подвели итоги выходных — за прошедшие выходные в Витебской области произошло 56 ДТП, в которых были травмированы два человека.

Инспекторы ГАИ задержали 29 нетрезвых водителей, пресекли 52 факта управления транспортными средствами лицами, не имеющими водительского удостоверения.

Также на выходных инспекторы ДПС внимательно следили, как пешеходы соблюдают ПДД. Всего 358 граждан нарушили эти правила, а из них 64 человека находились в состоянии алкогольного опьянения.

Госавтоинспекция продолжает проводить мероприятия, направленные на предупреждение дорожно-транспортных происшествий с участием нетрезвых водителей. Кроме этого, призываем всех участников дорожного движения проявлять повышенное внимание в переменчивых погодных условиях.

А.Смоленский

ЭКАНОМІКА

НАЛОГИ СТАЛИ ВЫШЕ

Увеличены в 2 раза ставки налога на недвижимость и земельного налога для жителей Витебска.

Опубликованы ставки налога на недвижимость и земельного налога, которые будут действовать в Витебске в 2023 году.

Ставка земельного налога для всех жителей города Витебска, которые являются плательщиками данного налога, увеличивается в два раза.

Ставки налога на недвижимость и земельного налога увеличиваются для организаций, за исключением тех, которые имеют преференции, увеличивается также в два раза.

Преференции (льготы) в прошлом году имели:

- организации, оказывающие в установленном законодательством порядке безвозмездную (спонсорскую) помощь спортивным учреждениям «Футбольный клуб «Витебск» и «Витебский хоккейный клуб», государственному учреждению физической культуры и спорта «Витебский областной клуб по игровым видам спорта».

- организации коммунальной собственности города Витебска, осуществляющие гостиничное обслуживание; клубы по игровым видам спорта, учредителем которых является Витебский городской исполнительный комитет; организации коммунальной собственности города Витебска, осуществляющие эксплуатацию жилищного фонда и предоставляющие жилищно-коммунальные услуги по техническому обслуживанию жилищного фонда по субсидируемым государством тарифам (ценам) на эти услуги для населения; областных объединений профсоюзов.

Не будем пытаться выяснить сумму помощи спортивным организациям города, полученную в результате таких преференций, пожелаем только витебскому спорту очередных достижений в текущем году.

А.Адамов

СОСЕДИ ПРИШЛИ НА ПОМОЩЬ

В Витебском районе при пожаре соседи спасли пенсионера.

12 сентября в 21.38 в центр оперативного управления Витебского городского отдела по ЧС поступило сообщение о пожаре. Горела квартира по улице Центральной в агрогороде Копти Витебского района.

По прибытии спасателей к месту вызова в подъезде 3-х этажного дома наблюдалось задымление, которое исходило из квартиры на первом этаже жилого дома.

До того, как прибыли спасатели, хозяина квартиры 1944 года рождения спасли его соседи, которые обнаружили задымление и проникли в жилище через незапертую дверь, нашли владельца квартиры и вынесли его на свежий воздух.

Пожар был ликвидирован пожарными, огнем в квартире закопчены стены и потолок, поврежден диван.

По данному факту проводится проверка, причина пожара устанавливается. Рассматривается версия – неосторожное обращение с огнем при курении хозяином.

А.Смоленскій

БАЗОВАЯ ЗА ПЕРЕСЕЧЕНИЕ ГРАНИЦЫ

37 рублей заплатят за пересечение госграницы на авто в Витебской области. Сбор за пересечение госграницы на авто продлен до 2025 года, но собирать его начнут с 1 февраля.

Витебский облсовет вновь ввел местный сбор за пересечение государственной границы транспортными средствами в пунктах пропуска.

Впервые такой сбор ввели решением областного Совета депутатов от 29 июня 2021 года и действовал он с 1 августа 2021 года по 1 января 2023 года.

Новое решение о введении такого сбора, теперь уже до 1 января 2025 года, было принято депутатами 30 декабря прошлого года. Оно было опубликовано 12 января и вступает в силу с первого числа месяца, следующего за месяцем его официального опубликования, т.е. — с 1 февраля 2023 года.

Как и прежде, сбор составляет одну базовую величину, сейчас это уже 37 рублей.

Документ также устанавливает нескольким категорий, которые освобождены от сбора за пересечение госграницы: сотрудникам госорганов, едущим по делам службы; иностранцам, приглашенным госорганами и госорганизациями; иностранцам, едущим на «Славянку», при наличие билетов на концерты; ветераны Великой Отечественной войны и ветераны боевых действий на территории других государств; иностранцы с документом, подтверждающим степень тяжести и выраженности затруднений физической активности и участия 75–100 процентов; белорусы, едущие за границу на лечение; иностранцы, выезжающие из Беларуси после санаториев или другого лечения; белорусы и иностранцы, выезжающие для ухода за тяжело больными родственниками; иностранцы, выезжающие из Беларуси после похорон родственников; а также все те, кого депортируют и нашей страны.

А.Адамов

МАХЛЯРСТВА

ДОВЕРЯЙ, НО ПРОВЕРЯЙ

30-летний житель Витебска лишился 4 600 рублей при покупке телефона в фейковом интернет-магазине.

Витеблянин, решив сэкономить на покупке дорогого мобильного телефона, стал очередной жертвой интернет-мошенников.

Мужчина вел поиски подходящего телефона в одной из социальных сетей. Он связался с продавцом, на чьей странице обнаружил самые выгодные цены. Одно из условий доставки смартфона курьером – полная оплата товара. Чтобы усыпить бдительность покупателя, ему сообщили, что товар можно забрать самостоятельно после совершения оплаты наличными в магазине, находящемся в другой области.

Удостоверившись, что такой магазин действительно существует, витеблянин перевел на указанные мошенниками реквизиты 4 600 рублей. А в торговой точке заявили, что аккаунт, с которого велась переписка, им не принадлежит.

Внимание: совершать покупки необходимо в официальных интернет-магазинах, не стоит переводить деньги в качестве предоплаты, оплату можно производить только после фактического получения товара.

А.Адамов

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

ОГУРЦЫ НОВОГО УРОЖАЯ

В тепличном комбинате УП «Рудаково» Витебского района в декабре стартовал очередной сезон выращивания огурцов с помощью досветки, чему предшествовала большая подготовительная работа овощеводов.

Как рассказала начальник производства тепличного комбината Раиса Крупатина, высадку растений произвели на площади 1,5 гектара 22 декабря.

И уже 27-го числа практически у каждой огуречной «лианы», тянущейся вверх, было по 6–8 листочков. А в новогоднюю ночь — уже по 10–12. Температура воздуха в теплицах «стеклянного городка» сейчас достигает 22–24 градусов со знаком плюс.

Первыми желтыми цветами растения должны порадовать дружный коллек-тив овощеводов уже 2–3 января. После чего, спустя 14 дней, а может, и раньше, начнется первый сбор свежих ароматных огурчиков гибридов «мева». Затем собранная продукция поступит в продажу собственной торговой сети и других магазинов, чтобы мы с вами смогли в полной мере вкусить плоды труда рудаковских овощеводов, зарядиться витаминами и легче переносить холода.

В последние дни уходящего года овощеводы выполняли постоянный технологический уход за растениями. При этом не забывали и беседовать со своими зелеными подопечными, чтобы те в свою очередь порадовали щедрым урожаем.

Светлана ЛЮБОЧКА
«Витьбичи»

БЕЛАРУСКАСЦЬ

НОВАЯ «СПРАВА НАЦЫЯНАЛІСТАЎ»? ШТО ЗАКІДАЮЦЬ ПАЎЛУ БЕЛАВУСУ

Следчы камітэт расказаў пра абвінавачванні, якія закідаюць стваральніку «Арт Сядзібы» і крамы symbal.by Паўлу Белавусу. Тое, як пра гэтыя абвінавачванні напісала БелТА, больш падобна на рыторыку сталінскіх часоў, піша Сяргей Пульша ў «Новым Часе». Нас ізноў чакае «справа нацыяналістаў»?

Начальнік упраўлення Следчага камітэта па Мінску Сяргей Паско распавёў, што Белавус «на працягу дзесяці гадоў вёў актыўную дзейнасць, накіраваную на змену дзяржаўнай улады неканстытуцыйным шляхам». «У 2011 годзе абвінавачаны для пошуку аднадумцаў пачаў трансліраваць патрэбную яму інфармацыю ў масы. Пад выглядам культурна-гістарычнага развіцця ў розных агульнадаступных сацыяльных сетках і на сайтах ён распаўсюджваў ідэі беларускага нацыяналізму, мэтай якіх з'яўлялася змена дзяржаўнай улады ў Беларусі».

«Ідэі беларускага нацыяналізму» — гучыць даволі цікава, асабліва «пад выглядам культурна-гістарычнага развіцця». Падаецца, пад гэтым следчыя разумеюць дзейнасць «Арт-Сядзібы», якая сапраўды генерыравала багата ідэй нацыянальнага адраджэння.

Як улада падхоплівала «нацыяналістычную дзейнасць»

Пачыналася «Арт Сядзіба» з невялічкага моўна-дыскусійнага клуба, памяшканне якога было знята ў завода «Гарызонт». Першы ціск на арганізацыю пачаўся менавіта з пазбаўлення гэтага памяшкання. За 2012 год Мінгарвыканкам тройчы адмовіў у прадастаўленні памяшкання «Арт Сядзібе». Што нарабіла ініцыятыва? Проста давала пляцоўку для публічных лекцый, прагляду кінафільмаў, абмеркавання культурных падзей і прэзентацый. На іх у якасці гасцей запрашаліся аўтары і журналісты — менавіта гэта стала падставай для «занепакоенасці» улад.

Дарэчы, у тым жа годзе «Арт Сядзіба» атрымала прэмію Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацый Беларусі «Чэмпіёны грамадзянскай супольнасці—2012» у намінацыі «Адмова года».

Аднак больш «Арт Сядзіба» была знакамітая сваімі незвычайнымі прабеларускімі акцыямі, якія (о, божухна!) потым альбо падхопліваліся уладай, альбо нават праходзілі сумесна з уладамі.

Самая вядомая ініцыятыва — «Дзень вышыванкі». Першапачатковая ідэя нарадзілася ў «Арт Сядзібы» і паспяхова прайшла на базе кірмашу ў Палацы мастацтваў. Але з 2016 года яе перахапіў БРСМ. І праводзіў не адзін раз ды з вялікімі размахам — на пляцоўцы каля Палаца спорту. Дайшло да таго, што ў БРСМе нават выдумалі «Вышываныча» — персанажа Тэлеграм-стыкераў «з нацыянальным каларытам», распрацаванага напярэдадні «Дня вышыванкі» 2018 года.

І гэта не адзіная ідэя, якую праўладныя актывісты «скамуніздзілі» ў «Арт Сядзібы». У снежні 2014 года ініцыятыва пачала раздаваць стужкі з беларускім арнаментам мінакам — акцыя прасоўвалася ў сацсетках з хэштэгам #беларускаястужка. За раздачу стужак нават затрымлівалі Паўла Белавуса, Франака Вячорку і фотакарэспандэнта Уладзя Грыдзіна.

А ў чэрвені 2015-га, пад чарговыя выбары Лукашэнкі, правапераемнікі камсамола прапанавалі сфатаграфавацца са стужкай з арнаментам або з чырвона-зялёнай стужкай і выкласці фота ў інтэрнэт пад хэштэгамі #вышыванка #выбары2015.

Звярніце ўвагу на год — наступны год пасля расійскага захопу Крыма і стварэння так званых «ЛНР» і «ДНР». Тады «георгіеўская стужка»ператваралася ў знак расійскай агрэсіі, і ўлады шалёна напружвалі мазгі, чым яе замяніць. БРСМ вырашыў «пазычыць» ініцыятыву «Арт Сядзібы», а стужка з яблыневай кветкай з'явілася пазней.

Апроч БРСМа, побач з Белавусам павінна сядзець і кіраўніцтва Федэрацыі футбола. Менавіта яно «спрыяла нацыяналістычнай дзейнасці», бо разам з «Арт Сядзібай» праводзілі конкурс «Мова — музыка — футбол». Больш за тое, ва ўмовах конкурсу выказвалася пажаданне, каб музыкі стваралі «песні па-беларуску з патрыятычным зместам, якія падымаюць дух, могуць гучаць на стадыёнах падчас футбольных матчаў»…

А арнамент на пакунках бабруйскага зефіру з азбукай арнаменту? А адпаведная прадукцыя ў «Камунаркі»? Усё гэта пайшло адтуль — з «нацыяналістычнай» цяпер «Арт Сядзібы».

Следчы камітэт наракае, што «Абвінавачаны (Павел Белавус — Рэд.) зарэгістраваўся ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і заснаваў таварыства з абмежаванай адказнасцю (крама па анлайн і афлайн продажы тавараў), пасля чаго пачаў праводзіць розныя масавыя мерапрыемствы. Створаныя бізнес-праекты адкрылі прадпрымальніку новыя магчымасці. Паколькі Беларусь заўсёды знаходзілася ў цэнтры ўвагі на палітычнай арэне, хутка знайшліся тыя, хто быў гатовы спансіраваць развіццё яго антыдзяржаўнай дзейнасці. Фігурант падпісаў не менш за 12 дагавораў з рознымі замежнымі прадстаўнікамі і кампаніямі. З тых часоў экстрэмісцкая дзейнасць на тэрыторыі Беларусі набывала новыя абароты дзякуючы ўліванням з-за мяжы».

Зразумела, размова ідзе пра краму symbal.by — самы паспяховы нацыянальны праект. …«Антыдзяржаўную», па цяперашнім меркаванні СК, дзейнасць крамы падтрымлівалі дзяржаўныя прадпрыемствы. «Мы зрабілі бел-чырвона-белую стужку на дзяржаўнай фабрыцы, сцягі шыем таксама на фабрыцы, якая шые і чырвона-зялёныя. І шмат рэчаў мы стараемся рабіць унутры Беларусі, паказаць, што гэта рэальна, гэта магчыма», — зазначаў Белавус.

«Мы сваімі дзеяннямі хочам паказаць, што гэта не апазіцыйны, а нацыянальны сімвал, пад якім Беларусь атрымала незалежнасць, які ўсе павінны паважаць і ганарыцца ім. Калі мы запусцілі крамы і пачалі прадаваць сувеніры, да нас пачалі хадзіць дзяржаўныя СМІ, асабліва калі пачаўся бум з вышымайкамі. Прыходзіць БТ, у нас „Пагоня", сцягі. Пытаемся: „Вы будзеце ўсё гэта здымаць?" — „Ну, мы здымем тое, што нам трэба..." Пачалі нас запрашаць і на дзяржаўныя мерапрыемствы, гарадскую масленіцу, розныя фестывалі», — казаў Белавус у 2015 годзе.

Але не толькі дзяржпрадпрыемствы ды БТ з асобнымі арганізатарамі гарадскіх свят спрыялі той «антыдзяржаўнай дзейнасці». Увесь Мінгарвыканкам дазволіў самую маштабную нацыянальную падзею 2018 года — адзначэнне 100-годдзя ўтварэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

На свята ля Опернага тэатра прыйшло каля 50 тысяч чалавек. І за гэта Белавус зноў быў узнагароджаны прэміяй НДА «Чэмпіёны грамадзянскай супольнасці».

Напэўна, менавіта гэта следчыя лічаць «стымуляцыяй варожасці суайчыннікаў у дачыненні да Радзімы»?...

На якую дзяржаву працуюць следчыя?

Пытанне толькі адно: калі вышэйпералічаная дзейнасць кваліфікуецца як «здрада дзяржаве» і называецца «антыдзяржаўнай», на якую тады дзяржаву працуюць следчыя? Ці сапраўды мову, культуру, беларускую сімволіку яны лічаць «нацыяналістычнай» і «антыдзяржаўнай»?

І яшчэ адна цытата ад Паўла Белавуса пра тое, для чаго ўся яго дзейнасць: «Для канчатковага фарміравання нацыі, яе праяваў, каб мы ўсё ж такі пачалі гаварыць „у нас у Беларусі", а не „как там у нас, у русских". Гэта трэба ўбіць людзям. Бо без гэтага не будзе сапраўднай дзяржавы, без гэтага ў нас у любы момант, калі прыйдуць тыя ж зялёныя чалавечкі, з'явіцца патэнцыйная пагроза, што ў нас будзе нешта такое, як з Украінай, з акупацыяй. Хоць мы нібы і хаўруснікі, і сябры, але ёсць гэтая пагроза. І важна хоць неяк паспрабаваць гэтую пагрозу паменшыць, у тым ліку і праз свядомасць».

Дык на якую дзяржаву працуюць следчыя?

(скарочана)

budzma.me

РАСІЯ

ЧЕГО НЕ ПОНИМАЮТ РОССИЯНЕ, ДЕКЛАРИРУЮЩИЕ ЛОЗУНГИ ТИПА «МОЖЕМ ПОВТОРИТЬ»

В 1945 году получилось же, почему же сейчас не получится? — пишет Дмитрий Чернышев.



В сорок пятом получилось только потому, что Америка с ее 50% мирового ВВП была на стороне СССР.

Процитирую Солонина: «Танк Т-34-85. Двигатель отлит из американского алюминия. Броня отлита на американских легирующих вольфраме и молибдене. Погон башни сделан на американском карусельном станке. Своих не было. 85-мм пушка рассверлена на американском оборудовании. Командир общался с подчинёнными по американской рации. Пушка стреляла снарядами, в гильзах которого американский порох. Латунная гильза сделана из американской латуни. В самом снаряде была американская взрывчатка. Резиновый бандаж на катках сделан с добавлением американского каучука. А так танк наш. А рядом с нашим танком шел американский Шерман».

У могучего Советского Союза на пике его развития было около 20% от мирового ВВП. И тот пупок развязался в экономической гонке. У путинской России около 2% мирового ВВП. И доля эта быстро сокращается. Ни на одну страну в мире не было наложено такого количества санкций.

В 1980 году номинальный ВВП СССР был около в $1,2 трлн, а ВВП Китая — в $226 млрд. В пять с лишним раз больше, чем у китайцев. В 2017 российский ВВП приблизился к $1,6 трлн, а ВВП Китая — около $12 трлн. В семь с половиной раз меньше.

В 1990 году доля РСФСР в мировой добыче нефти составляла 16,2%, а газа — 29,8%, а по итогам 2015 года эти показатели снизились до 12,4 и 12,3%. Россия все проспала в экономической гонке.

Экономика России давно не представляет из себя ничего серьезного. Процитирую Иноземцева: По высокотехнологичному экспорту ($9,84 млрд в 2014 году) мы более чем втрое отстаем от в прошлом нищего Вьетнама ($30,86 млрд), от Сингапура — почти в 14 раз ($137,4 млрд), а от Китая ($558,6 млрд) — в 57 раз. В 2016 году Россия впервые экспортировала нефти и газа меньше (на $107,9 млрд), чем Китай — одних лишь мобильных телефонов (на $116,1 млрд).

Совокупные прямые инвестиции российских компаний за рубеж составляли в 2013 году $439 млрд — около 16% от китайских и менее 3,5% от европейских.

Слабая экономика = слабая армия. Тихоокеанский флот существенно уступает военно-морским силам одной Южной Кореи. Даже довоенный Черноморский флот был гораздо слабее турецкого флота. На всю Россию произведено всего несколько истребителей пятого поколения (включая прототипы). У американцев F-22 под двести штук. И F-35 — под две тысячи.

Производство танков Армата провалено. Производство ракет Сармат и Циркон провалено. Импортозамещение провалено. Практически ничего из заявленных разновидностей чудо-оружия не существует в действительности. 80% всех денег, выделенных на российский ВПК, разворовано.

Производительность труда в России находится на уровне стран третьего мира. Если в американской компании Lockheed Martin в год на одного сотрудника приходилось $407 тысяч выручки, то в российской ОАК этот показатель составлял 404 тысячи, но рублей.

Современная война — это война разведок. Запад знает о планах России все. Отслеживается каждый танк, каждый бензовоз и каждая группа военных. Это как играть в покер с открытыми картами против соперника, чьих карт вы не видите — безнадежно. Военная промышленность США и Европы быстро набирает обороты. Война превратится в избиение.

За Украину сегодня весь мир, за путинскую Россию — только Иран, Беларусь и Северная Корея.

Ничего россияне не смогут повторить. И это прекрасно. Победа путинской России стала бы катастрофой для всего мира.

gazetaby.info

АНАЛІТЫКА

ИТОГИ САМОГО ДРАМАТИЧЕСКОГО ГОДА В ИСТОРИИ НЕЗАВИСИМОЙ БЕЛАРУСИ

Политолог Валерий Карбалевич — о том, каким 2022 год оказался для нашей страны: «Перед угрозой войны меркнет неприятие диктатуры».

— Неожиданно прилетел «черный лебедь» в виде войны России против Украины, — пишет Карбалевич в Свободных новостях. — Это и стало основным фактором, повлиявшим не только на Беларусь, но и на всю международную политику. Но прежде всего, война уже оказала сильное воздействие на наш регион, на соседей.

Чем бы она ни закончилась, станет сильным катализатором деградации России. Развитие страны заблокировано на институциональном уровне. Путин, развязывая войну, хотел изменить правила функционирования системы международных отношений.

Они действительно меняются. Но не в пользу России. Время работает против Российской Федерации. Каждый день продолжения войны — это новый шаг к разрушению его прежнего статуса.

Война запустила процесс интеграции Украины в ЕС. Без войны такого шанса у Украины не было бы.

События этого года показали, что распад СССР не закончился, он продолжается.

О чем свидетельствует не только война в Украине, но и война между Азербайджаном и Арменией, между Таджикистаном и Кыргызстаном. Итогом войны в Украине станет дезинтеграция постсоветского пространства.

Как война в Украине повлияла на Беларусь?

Только в этом году стало понятно, что неразрешенность внутрибелорусского конфликта стало фактором, стимулирующим войну в регионе, обернулась втягиванием страны в глобальный геополитический конфликт.

Война создала вторую линию изоляции для режима Лукашенко. Первая появилась после 2020 года, когда Запад не признал Лукашенко президентом. А война превратила Беларусь, вместе с Россией, в международных изгоев.

Второй вызов, также явившийся следствием войны, — сужение суверенитета Беларуси, возрастание влияния России на нашу страну.

Война углубила раскол белорусского общества, но провела несколько другие линии раздела. Оказалось, что какая-то часть отрицательно относится к Лукашенко, но любит Путина. Война дополнила ценностный раскол геополитическим. Причем, исчезает середина, уменьшается количество неопределившихся, скукоживается доля сторонников нейтралитета Беларуси.

Логично, что тема безопасности вышла на первое место в массовом сознании, вытеснив другие вопросы, вокруг которых два года пылали страсти. Перед угрозой войны меркнет неприятие диктатуры.

И тут мы наблюдаем определенный парадокс массового сознания: Лукашенко, втянувший Беларусь в войну, удалось выступить для большинства белорусов гарантом мира.

Также выяснилось, что режим абсолютно не интересует бизнес-климат в стране. Хотя, казалось бы, властям нужны деньги в бюджете. Но власти совершенно не волнует, какой образ Беларуси создается на экономической карте мира. Правительство отказалось возвращать долги в валюте, создавая ситуацию дефолта. Лукашенко запретил иностранным собственникам выводить капитал за границу.

Важнейшим итогом года стала быстрая трансформация авторитарного режима в тоталитарный. Беларусь по многим показателям вернулась в СССР сталинских времен (беспредел карательных органов, огромные сроки заключения по «политическим» статьям). Из книжных магазинов стали изымать «неправильные» книги. Страна в шаге от костров из книг.

Именно по итогам этого года становится понятным, что Лукашенко никуда уходить не собирается. В пользу этого свидетельствует и беспощадный террор против своих оппонентов, усиленный к концу года, и культ личности вождя, который активно пропагандируется государственными СМИ.

Спираль белорусской драмы закручивается максимально жестко

«Филин»
gazetaby.info

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

СССР БЫЎ НАЗАЎЖДЫ, ПАКУЛЬ НЕ СКОНЧЫЎСЯ. ПАДСТАВА ДЛЯ ПЕРАДНАВАГОДНЯГА АПТЫМІЗМУ

Бессэнсоўна шукаць прычыны дэградацыі ў інтрыгах імперыялістаў. Дэградацыя ішла ад жыцця, у якім дзяржава рабіла выгляд, што плаціць, а «правільны грамадзянін» у адказ рабіў выгляд, што працуе. Увесь гэты цырк з конямі на працягу дзесяцігоддзяў суправаджаўся абменам правільнымі словамі.

Тэма асобы палітыка як выдуманай сутнасці была закранута ў папярэднім артыкуле. Прашу прабачэння за самацытаванне, але без яго не абысціся: «...у кожнага медаля ёсць адваротны бок. Тыя, хто ствараe выдуманую сутнасць палітыка, міжвольна ствараюць і выдуманую сутнасць народа. У выніку тое, што наверсе прымаюць за народ, аказваецца тульпай — гэта значыць, паранармальным аб'ектам, створаным сілай думкі».

Здзіўляцца гэтаму не даводзіцца, асабліва калі прыгадаць, што першая палова XX стагоддзя — гэта час панавання таталітарных ідэалогій: фашысцкай, нацысцкай і камуністычнай. Помнікі аднаму з заснавальнікаў апошняй усё яшчэ ўпрыгожваюць цэнтральныя плошчы беларускіх гарадоў.

У паэта Барыса Пастарнака ў паэме «Высокая хвароба» на тэму народа як выдуманай сутнасці ёсць геніяльныя радкі:

«Столетий завистью завистлив,
Ревнив их ревностью одной,
Он управлял теченьем мыслей
И только потому страной».

Ён — «правадыр сусветнага пралетарыяту» Уладзімір Ленін. Яму і дадзім слова: «Кожны агітатар павінен быць дзяржаўным кіраўніком, кіраўніком усіх сялян і рабочых у справе эканамічнага будаўніцтва» (03.11.1920).

Нескладана заўважыць, што назоўнікі «агітатар» і «кіраўнік» для «самага чалавечнага чалавека» з'яўляюцца сінонімамі. Таму цэнтральнай задачай усіх таталітарных рэжымаў робіцца задача па фарміраванні «правільных грамадзян», здольных крочыць у адзіным страі, у кірунку, які паказаў і вызначыў правадыр.

Задачка з зорачкай

«Правільнаму грамадзяніну» на заклік партыі і ўрада «Будзь гатовы!» належала ўскідваць руку ў салюце і рапартаваць «Заўсёды гатовы!». І каб такі рытуал давесці да аўтаматызму, гэтаму навучалі з дзяцінства. Але не дапамагло. У адрозненне ад сваіх бацькоў, мае аднагодкі (народжаныя ў 1960-я гады), на заклік «Будзь гатовы!» у думках дадавалі «Ганяць катоў».

Гэта, на першы погляд, нявіннае думказлачынства сведчыла пра дэградацыю эксперыменту па фарміраванні «правільнага грамадзяніна».

Бессэнсоўна шукаць прычыны дэградацыі ў інтрыгах імперыялістаў. Дэградацыя ішла ад жыцця, у якім дзяржава рабіла выгляд, што плаціць, а «правільны грамадзянін» у адказ рабіў выгляд, што працуе. Увесь гэты цырк з конямі на працягу дзесяцігоддзяў суправаджаўся абменам правільнымі словамі.

Вось як яго апісвае навуковы кіраўнік «Левада-Цэнтра» Леў Гудкоў: «Уладам не давяраюць, але пры гэтым дэманструюць ім знешнюю лаяльнасць. На іх спадзяюцца, але адначасова надзяляюць іх самымі агіднымі якасцямі. Двудумства (выдзелена. — С. Н.) — адзін з найбольш дзейсных механізмаў адаптацыі да рэпрэсіўнай дзяржавы, да ўлады, непадкантрольнай людзям».

Чым скончыўся савецкі варыянт двудумства — добра вядома. Пра яго ўклад у «геапалітычную катастрофу XX стагоддзя» прафесар антрапалогіі ў Каліфарнійскім універсітэце ў Берклі Аляксей Юрчак напісаў кнігу «Гэта было назасёды, пакуль не скончылася». Яе нескладана адшукаць у інтэрнэце — пачытайце, рэкамендую.

Кіраваць плынню думак, не фільтруючы пры гэтым базар — задачка з зорачкай. Адна справа — фарміраванне «правільнага чалавека» ў прамысловым маштабе, і зусім іншая — адзінкавая вытворчасць «інжынераў чалавечых душ». Урэшце ўсё ўпіраецца ў рэсурсы. Не толькі элітнай нерухомасцю на Блакітным беразе і возеры Кома, але і цёплымі прыбіральнямі ў дамах усіх не забяспечыць. Ніякай прыроднай рэнты для гэтага не хопіць, колькі нафты не пампуй.

Таму ў двудумства дзве складовыя часткі. Для «правільнага чалавека» двудумства — механізм адаптацыі да рэпрэсіўнай дзяржавы, для «інжынераў чалавечых душ» — механізм кіравання рухам думак.

Свежы прыклад. Следчы камітэт Расіі не знайшоў складу злачынства ў публічных заклiках журналіста Антона Красоўскага тапіць і паліць украінскіх дзяцей. У той жа час за аналагічны заклік адносна дзяцей расійскіх сілавікоў блогер Уладзіслаў Сініца атрымаў у 2019 годзе пяць гадоў калоніі.

Пра ролю інклюзіі ў росквіце

Нават у вырабаў са сталі, калі яны пастаянна зведваюць нагрузкі, надыходзіць стомленасць, яны псуюцца — ламацца можа нават жалеза. Чаго ж тады чакаць ад прадстаўнікоў роду чалавечага? З дапамогай польска-амерыканскага палітолага Адама Пшэворскага прыгадаем час Перабудовы: «Людзі мелі вострую патрэбу ў нейкай ідэйнай гармоніі: калі іх думкі і словы пастаянна не адпавядалі адно аднаму, то жыццё станавілася невыносным. Таму патрабаванне «праўды» стала, прынамсі, такім жа важным, як і патрабаванне хлеба...».

Аўтарства слогана «Хлеба і відовішчаў!» належыць рымскаму паэту Ювеналу (1–2 стагоддзе нашай эры). З тых часоў попыт ні на хлеб, ні на відовішчы не знізіўся. Аднак жыццё не стаіць на месцы, і па меры хай і павольнага, але няўхільнага задавальнення базавых патрэб, фарміруюцца новыя. Міжнародная статыстыка сведчыць, што ўсё часцей на масавых акцыях пратэсту гучаць не эканамічныя, а палітычныя патрабаванні.

Як тут не згадаць лозунг «Не падаткаабкладанню без прадстаўніцтва», які ўзнік падчас амерыканскай рэвалюцыі (1775–1783 гады) і выказваў адну з асноўных прэтэнзій амерыканскіх каланістаў да Вялікабрытаніі.

Сучаснае лідарства Амерыкі не са столі ўзялося. Яно — прамое следства больш чым 200-гадовага вопыту будаўніцтва інклюзіўных (лац. inclusivus — «уключаны») палітычных інстытутаў.

Ролі інклюзіўных інстытутаў у эканамічным росце прысвечаны адзін з галоўных палітэканамічных бестселераў XXI стагоддзя — кніга эканамістаў Дарона Аджэмоглу і Джэймса Робінсана «Чаму адны краіны багатыя, а іншыя бедныя». У чытачоў «НЧ», у сувязі з набліжэннем Новага года, ёсць магчымасць зрабіць сабе падарунак — знайсці кнігу ў сеціве.

Аўтар жа гэтага артыкула абмяжуецца адной цытатай з прадмовы да бестселера: «Жыхары Егіпта, гэтак жа, як і Туніса (гаворка ідзе пра «Арабскую вясну». — С. Н.), былі ўпэўненыя, што іх эканамічныя цяжкасці тлумачацца перш за ўсё адсутнасцю ў іх палітычных правоў. Калі дэманстранты пачалі вылучаць больш канкрэтныя патрабаванні, то першыя дванаццаць пунктаў аказаліся выключна палітычнымі».

***

Уякасці навагодніх пажаданняў нароўні з традыцыйнымі — здароўя, шчасця і любові — аўтар зычыць суайчыннікам разумення ролі палітычных правоў у культурным і эканамічным росквіце.

Сяргей Нікалюк
"Новы Час"

Заснавальнік і рэдактар: Смолікаў Канстанцін Эдуардавіч

Адрас рэдакцыі: г. Віцебск, вул. 1-я Сененская д.5,
Тэл. +375-29-218-98-38, e-mail: bigsmoll2007@gmail.com
Газета выдаецца з лютага 2014 г.

Падпісана да друку 16.01.2023 у 20.20
Наклад: 290 асобнікаў.
Выдаецца адзін-два разы на месяц на беларускай і расійскай мовах.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Друкуецца пры падтрымцы аднадумцаў.
Распаўсюджваецца бясплатна дабраахвотнікамі.